Вскоре начались столкновения между участниками антиправительственных протестов, пытавшимися прорваться к зданиям правительства и парламента, и милицией. На улице Грушевского было сожжено значительное число автомашин, использовавшихся для транспортировки бойцов внутренних войск и подразделения “Беркут” для борьбы с беспорядками. Также загорелись кассы расположенного поблизости стадиона “Динамо”. В результате беспорядков пострадали десятки людей с обеих сторон.

Лидер партии “УДАР” Виталий Кличко подчеркнул, что сейчас ситуация в стране близка к гражданской войне. На фото- и видеокадрах с Грушевского видно, что группы протестующих бросали бутылки с зажигательной смесью в милиционеров и нападали на них с палками. Милиция применила газовые и светошумовые гранаты, а затем и водометы, несмотря на температуру минус 9 градусов по Цельсию.

Массовые акции протеста в Киеве в воскресенье возобновились с новой силой после того, как в четверг большинство, которое в Раде составляют союзники Януковича, проголосовало за пакет законов, призванных затруднить уличные манифестации, сотрясающие страну с ноября, когда правительство отказалось подписать соглашение об ассоциации с Евросоюзом.

Украинская оппозиция считает, что законы, аналогичные тем, которые принимались в 2012 году в России с целью подавления протестного движения, были приняты с нарушением процедуры и противоречат конституции Украины по своей сути.

Виктор Янукович окончательно выбрал для Украины белорусско-российский путь, делают вывод “Ведомости” в своей редакционной статье. Сначала Москва успешно применила в борьбе с инакомыслящими импортированные из Беларуси законодательные запреты. Теперь и в Украине принят пакет репрессивных законов, во многом копирущих соответствующее российское законодательство, отмечают журналисты газеты.

Соединенные Штаты обвинили власти Украины в обострении ситуации в стране, заявили о возможных санкциях к ним, потребовали вывести милицейский спецназ из центра Киева и начать диалог с оппозицией.

“Растущая напряженность в стране — прямое следствие того, что правительство не признало законного недовольства народа. Вместо этого оно предприняло действия, чтобы ослабить основы демократии Украины, объявить преступлением мирный протест и лишить гражданское общество и политических оппонентов ключевых демократических мер защиты, предусмотренных законом”, — заявила представитель Совета национальной безопасности при Белом доме **Кэйтлин Хейден.**

Западные страны также осудили новые изменения в украинском законодательстве. Они высказывали серьезное беспокойство по поводу событий в Киеве и призывали искать ненасильственное, политическое решение кризиса. Глава миссии ЕС в Киеве **Ян Томбинский** обратился к протестующим с призывом не обострять ситуацию. “Нападения на полицию могут дать аргументы тем, кто не поддерживает политическое урегулирование кризиса”, — говорится в опубликованном в Facebook заявлении Представительства ЕС в Украине. “С озабоченностью следим за бурными столкновениями в Украине. Насилие — не ответ”, — написал в Twitter министр иностранных дел Великобритании **Уильям Хейг**.

Президент Украины Виктор Янукович заявил о готовности к переговорам с оппозицией, сообщили лидеры Евромайдана, добивавшиеся встречи с ним. Лидер партии “УДАР” **Виталий Кличко** сообщил, что провел встречу с президентом и Янукович пообещал создать специальную комиссию, которая займется решением кризисной ситуации в стране.

Антон КРАВЦЕВИЧ.

У СУСЕДЗЯЎ

Лаўрэаты прэміі — «Эканамічная маліна»

Як паведамляе “Польскае радыё для замежжа”, у Польшчы абвешчаны лаўрэаты прэміі „Эканамічная маліна” за 2013 год.

„Эканамічная маліна” — гэта антыпрэмія, якая прысуджаецца тым, хто аказаў найбольш негатыўны ўплыў на развіццё польскага прадпрымальніцтва. “Маліны” ўжо чатыры гады запар прысуджае арганізацыя „Працадаўцы РП”.

Лаўрэатамі за 2013 год сталі: былы віцэ-прэм’ер і міністр фінансаў Яцэк Растоўскі, Міністэрства фінансаў і кампанія „ERBUD”.

Стратэгія для польскай анкалогіі

Да канца года ў Польшчы плануецца распрацаваць “Стратэгію для польскай анкалогіі”. Над падрыхтоўкай дакумента працуе група звыш ста экспертаў у галіне анкалогіі, грамадскага здароўя, эканомікі, арганізацый спецыялістаў і пацыентаў.

Падобную стратэгію для анкалогіі прынялі каля 30 гадоў таму ў Злучаных Штатах Амерыкі і 13 гадоў таму — у Францыі. Гэта дало хуткае і рашучае паляпшэнне вынікаў лячэння анкалагічных захворванняў.

У Польшчы пакуль шмат праблем у гэтай справе. Ёсць класная тэхніка, але яна часта прастойвае, бо закончыліся грошы з лімітаў на выкарыстанне абсталявання.

Польскае Таварыства анкалогіі напісала ліст па гэтым пытанні прэзідэнту **Браніславу Камароўскаму,** прэм’ер-міністру **Дональду Туску,** міністру аховы здароўя **Барташу Арлуковічу.** У лісце лекары прапануюць адмяніць ліміты на паслугі ў галіне лячэння ракавых пухлін, — адзначае старшыня таварыства прафесар **Яцэк Ясэм.**

“Калі абмежаваны сродкі, адкладваем працэс лячэння да таго часу, калі з’явяцца грошы. Але ў анкалогіі час — гэта самы важны фактар. У адрозненне ад іншых захворванняў, рак не чакае. Нельга сказаць пацыенту, каб прыйшоў праз паўгода, калі будуць грошы. Стратэгія для анкалогіі павінна дапамагчы вырашыць існуючыя праблемы і палепшыць лячэнне хворых”, — лічаць польскія медыкі

.

Андрэй СЯРГЕЕЎ.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Іван БУДНІК

За волю!

(Да падзей 1863—1864 гадоў на Гарадзеншчыне)

(Працяг. Пачатак у №№3,4.)

Колькасны склад атрада А.Лянкевіча, як і іншых, не быў пастаянны, хутка папаўняўся. Праз дзень тысяцкі з м.Азёры даносіў у Парэчча, што ў мястэчку знаходзіўся *“з шайкой в 500 чалавек Ленкевич”.* Яго шукала і пераследавала воінская каманда падпалкоўніка Мантэйфеля. У раёне “Святога балота” адбыўся першы бой толькі што створанага атрада з рэгулярным войскам, у якім паўстанцы, дрэнна ўзброеныя, слаба абучаныя, былі разбіты і панеслі вялікія страты: адны загінулі ад куль ворага, другія прапалі ў топкім багністым балоце. Рэшткі атрада адступілі ў бок Парэчча і ў Ваўкавыскі павет. Падпалкоўнік Мантэйфель устрымаўся ад пераследу, баючыся загінуць у балоце, і паспяшаўся адрапартаваць “наверх”, што *“шайка мятежников в 200 человек во главе с Ленкевичем разбита”.*

Мястэчка Азёры і далей з’яўлялася нейкай апорай у паўстанцаў. Усе слаі грамадства мястэчка: і ўладальнік маёнтка граф Леапольд Валіцкі, і шляхта, і дваровыя служачыя, і сяляне, і мяшчане, і святары — падтрымлівалі паўстанцаў, дапамагалі і спачувалі ім. Дзясяткі жыхароў мястэчка папоўнілі атрад А.Лянкевіча, сярод іх быў і ксёндз Янушкевіч, які прыводзіў новых байцоў да прысягі. Былы ўніяцкі свяшчэннік Сцяпан Германовіч пасылаў сваіх дачок у лес з прадуктамі для паўстанцаў. Іх вазілі ў атрад і пляменніца Л.Валіцкага Людвіка і дачка панскага аканома Шмігера Амелія, а сын аканома быў начальнікам невялікага атрада паўстанцаў.

Паўстанцкія камандзіры выкарыстоўвалі своеасаблівую тактыку ў час сутыкненняў з моцнай воінскай камандай: атрад загадзя быў падзелены на невялікія групы па 20—25 чалавек і па камандзе начальніка ў час найбольшай небяспекі “знікаў”, рассейваўся, каб праз дзень-другі зноў сабрацца ў прызначаным месцы. Так было пазней і з атрадам А.Лянкевіча. Ужо праз дзень земскі спраўнік рапартаваў губернатару, што *“сего числа* (23 апреля. — **І.Б.**) *шайка появилась в околице Котра в 4 часа ночи, 24 чалавека, побывали у дозорцы Фомы Гомулецкого... ушли по дороге в м.Каменку”.* У другім рапарце ён дапаўняе, што ў той жа дзень у 2 гадзіны папаўдні ў маёнтку Чарлёна з’явілася ўзброеная шайка і ўзяла з канюшні князя Друцкага-Любецкага пяць коней са збруяй і вазамі і два верхавыя кані з сёдламі і рушыла па дарозе да Мількаўшчыны на Віленскі тракт. У гэты дзень лунненскі станавы прыстаў пасля абеду бачыў атрад мяцежнікаў каля вёскі Дубна, і накіроўваўся ён на Зяльвяны ў Ваўкавыскі ўезд. Частка атрада А.Лянкевіча перайшла ад Парэчча да Друскенік і пераправілася праз Нёман у Аўгустоўскую пушчу, дзе з атрадам Вавера ўдзельнічала ў баях з царскімі войскамі.

Атрад А.Лянкевіча ў поўным складзе або асобнымі групамі дзейнічаў як у Гродзенскім павеце, так і ў суседніх — Ваўкавыскім, Слонімскім, Аўгустоўскім і на поўдні Літвы, падтрымліваючы сувязі з тамашнімі атрадамі. У маі каля вёскі Мілавіды Слонімскага павета сабраліся асноўныя паўстанцкія сілы Гродзенскага (А.Лянкевіч), Ваўкавыскага, Слонімскага (Ф.Юндзіл) паветаў, каб аб’яднанымі сіламі даць бой расійскім карнікам. Агульнае камандаванне прыняў на сябе найбольш спрактыкаваны ў ваеннай справе падпалкоўнік царскай арміі А.Лянкевіч. У лагер пад Мілавідамі змаглі прыехаць, нягледзячы на небяспеку быць арыштаванымі па дарозе, К.Каліноўскі з Э.Заблоцкім з мэтай навядзення парадку ў арганізацыях Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў і пашырэння паўстання. Тут Каліноўскі правёў агляд паўстанцкіх сіл. На наступны дзень, 22 мая, каля тысячы паўстанцаў, узброеных стрэльбамі, пісталетамі, косамі, паспяхова змагаліся з рэгулярнымі войскамі. Ім процістаялі пад камандай палкоўніка А.Чартова тры роты Стараінгерманландскага пяхотнага палка, сотня казакаў, артылерыя. Паўстанцы нанеслі праціўніку значныя страты, і царскі палкоўнік запрасіў падмацавання. Паўстанцы пакінулі поле бою і сышлі ў суседнія паветы.

Аб баявых дзеяннях паўстанцкіх атрадаў мы можам меркаваць толькі па рапартах начальнікаў воінскіх каманд, якія ваявалі з паўстанцамі, дакладах паліцэйскіх, што адсочвалі іх перамяшчэнні, прызнаннях тых, хто трапіў у палон паўстанцаў. Акрамя таго, у раёне захавалася шмат памятных месцаў, звязаных з баявымі дзеяннямі паўстанцаў 1863 года. Такімі з’яўляюцца калектыўныя магілы паўстанцаў, што загінулі ў лесе каля в.Кадыш, у Мінявіцкім лесе, на “Святым балоце”, Канюхоўскі роў каля в.Віцькі, Коматаўская пераправа. Мінявіцкі лес — уладанне Івана Каменскага, які, будучы акруговым начальнікам, арганізаваў у сваім маёнтку ўсебаковую дапамогу паўстанцам: прадуктамі харчавання, фуражом, адзеннем, вырабам пікаў, адліўкай куль і г.д. Аб яго дзейнасці данёс уладам адзін з яго былых залежных сялян.

Коматаўская пераправа знаходзілася каля вёскі Коматава і выкарыстоўвалася паўстанцамі ў дзеяннях супраць царскіх войск. На крутым левым беразе Нёмана, насупраць Коматава, вёсачка Пескі і яе лясныя ваколіцы былі зручным прыстанішчам для паўстанцаў: тут у глыбокім і доўгім рове (Канюхоўскім) яны хавалі і падкоўвалі ў кузні сваіх коней, рыхтаваліся да баёў. Мясцовыя жыхары расказвалі, што ў гэтым месцы адбыўся крывавы бой паўстанцаў з казакамі, якія непрыкметна пераправіліся праз раку, захоўваліся магілы і курганы загінуўшых (Гарадзенскія запісы, вып.1, Гародня, 1993 г., с. 90). Недалёка адсюль знаходзілася Панямунская каталіцкая капліца, дзе паўстанцы часам знаходзілі прытулак і падтрымку. Аб гэтым стала вядома станавому прыставу з м.Індура Смарагдаву, і ён з атрадам казакаў зрабіў налёт на капліцу. Учынены імі вобыск прывёў да таго, што ксёндз Ігнатовіч не мог болей праводзіць у ёй набажэнствы і закрыў яе.

Мясцовыя жыхары дапамагалі паўстанцам і далучаліся да іх. Аб гэтым сведчыць і факт вяртання з сібірскай ссылкі некаторых тутэйшых жыхароў. У снежні 1884 г. на аснове царскай амністыі ад 15 мая 1883 г. у вёску Жукевічы Горніцкай воласці вярнуліся з Сібіры Дамінік Іванавіч Гілюк і Якаў Восіпавіч Гасперскі, сасланыя за ўдзел у паўстанні. Толькі пакарыстацца “дараваным правам” ім не дазвалялі паліцэйскія ўлады, імкнучыся выдаліць з губерні: былым паўстанцам забаранялася пражываць у Паўночна-Заходнім краі. Вясной 1863 г. у паўстанцы пайшлі сыны ўладальнікаў невялікага маёнтка Пескі Соф’і і Вікенція Гласкаў — Іосіф і Юльян. Іосіф Гласка ўдзельнічаў у нападзе на чыгуначную станцыю Гродна 2 сакавіка 1863 г., быў арыштаваны, ваяваў у паўстанцкіх атрадах Аўгустоўскага павета і загінуў у канцы мая каля Кадыша ў бітве з царскімі карнікамі. А яго брат Юльян, па сведчанні ваенна-следчай камісіі, *“у 1863 г. паступіў у мяцежніцкую шайку, якая была пад начальствам Ваўра і дзейнічала ў Сувалкаўскім павеце, але ў сувязі з хваробай... сышоў за граніцу”.*

Самы дзейсны ўдзел у паўстанні прыняў спадчыннік маёнтка Жукевічы той жа Горніцкай воласці Віктар Гласка, які, не маючы ў той час 25 гадоў, у валоданне маёнткам уступіць не паспеў, і ў ім гаспадарыла яго сястра. Перабраўшыся ў Царства Польскае, ён узначаліў паўстанцкі атрад у 150—200 чалавек і паспяхова змагаўся з расійскімі карнікамі ў маі 1863 г. пад Кадышом у Сапоцкінскай зоне, у Свентаянскіх лясах, пад Алітай, у Аўгустоўскім і Сейненскім паветах. Аб дзейнасці яго атрада і жорсткіх баях з войскамі расказвалі на допытах захопленыя ў палон паўстанцы Іван Семяноўскі з маёнтка Вільянова пад Азёрамі, Іван Бура, казённы селянін з в.Яскілевічы, Восіп Высоцкі, аднадворац з-пад Парэчча, якія знаходзіліся ў гэтым атрадзе. Літоўскім рэвалюцыйным камітэтам яму было нададзена званне маёра. Паўстанцкі атрад В.Гласкі змагаўся *“до окончательного уничтожения мятежа”* (так дакладаў губернатар у Вільню), пасля чаго яго начальнік падаўся ў эміграцыю. А калі добраахвотна вярнуўся ў 1872 г. у Варшаву, быў арыштаваны і адпраўлены ў турму. Толькі цяпер маёнтак Жукевічы быў секвестраваны і перададзены ў дзяржаўнае кіраванне, а пасля быў прададзены расійскаму чыноўніку.

У чэрвені—ліпені паўстанцы яшчэ актыўна дзейнічалі на тэрыторыі павета: каля ст.Парэчча, лясных вёсак Узбераж, Глушнева, Бабіна, Баброўня, Бандары, вакол Скідзеля, Мількаўшчыны, Каменкі, у Сапоцкінскай зоне Аўгустоўскага павета. Яны нападалі на канторы лясніцтваў, паштовыя станцыі, валасныя ўправы, уступалі ў схваткі з карнымі камандамі. Паўстанцкія атрады і асобныя групы ў многіх месцах карысталіся падтрымкай мясцовых жыхароў. Аб гэтым сведчаць і прадстаўнікі ўлады. Так, палкоўнік Шчарбацкі, які служыў у штаце пры губернатары, дакладаў 5 ліпеня ў Гродзенскую следчую камісію, што ён ужо тры дні рухаецца разам з воінскай камандай па паўднёвай частцы павета і не можа атрымаць *“от многих жителей какие бы то ни было сведения о шайках мятежников, безвыходно находящихся в этих местах уже несколько недель, и несмотря на то, что на каждом шагу встречаются здесь несомненные и свежие следы шайки, до сих пор она не могла быть открыта и истреблена, хотя для этай цели постоянно направляются отряды из Гродно, Лиды и Волковыска”.*

Паўстанцкія атрады і іх камандзіры набывалі баявы вопыт, удасканальвалі тактыку, праяўлялі стойкасць і вынаходлівасць. Камандзір 3-га батальёна Неўскага пяхотнага палка маёр фон Крэмер адзначаў у сваім рапарце 3 чэрвеня, што, пераследуючы атрад А.Лянкевіча, ён паспрабаваў яго атакаваць каля Ваўкавыска. У лесе шайкай была арганізавана абарона. Войскі паспрабавалі пайсці ў атаку і былі адбіты, пасля адступілі, каб выманіць мяцежнікаў і разбурыць іх абарону. *“Мятежники 8 раз бросались вперед с криком “Ура!”, но всё же отступили в непроходимые болота... Партия эта числом до 700 человек пеших и 40 конных... имела правильную организацию, т.е. рассчитана на роты”* і мела вайсковых камандзіраў.

Меры па падаўленні паўстання

Супраць паўстанцаў у Гродзенскім і суседніх паветах вялі баявыя дзеянні пяхотныя палкі: Калужскі, Неўскі, Пскоўскі, Велікалуцкі, Стараінгерманландскі, лейб-гвардыі Сямёнаўскі, Курляндскі полк уланаў, Данскі 33-і казацкі полк. З іх складаліся воінскія каманды, куды ўключалі 2—3 пяхотныя роты, роту ўланаў, паўсотні або некалькі дзясяткаў казакаў, некалькі гармат. Такі склад карных камандаў дазваляў весці як абарончыя, так і наступальныя дзеянні, забяспечваць ачыстку тэрыторыі і пераследаванне “мяцежнікаў” у конным страі.

Дысцыплінаванай, добра ўзброенай і абучанай камандзе рэгулярнага войска не маглі процістаяць слаба арганізаваныя, неабучаныя, не нюхаўшыя пораху сялянскія хлопцы і шляхцiцы, узброеныя косамі і зрэдку ружжамі, хаця і праяўлялі гераізм і стойкасць.

У сярэдзіне 1863 г. у выніку рэпрэсій і карных вайсковых аперацый, прапагандысцкіх мер з боку ўрада адбываецца спад баявых дзеянняў паўстанцкіх атрадаў. Некаторыя з членаў Гродзенскай паўстанцкай арганізацыі былі арыштаваны і знаходзіліся ў турме, пад ціскам рэпрэсій частка шляхты і памешчыкаў пачала адыходзіць ад паўстання. У сувязі з арыштамі членаў віленскага Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы на пачатку чэрвеня ў Вільню быў выкліканы К.Каліноўскі і ўведзены ў яго склад. Адначасова адбыліся змены і на Гродзеншчыне: на месца ваяводскага камісара Кастусь Каліноўскі, прыехаўшы ў Гродна, прапанаваў прызначыць Эразма Заблоцкага, цывільным ваяводскім начальнікам быў намінаваны Станіслаў Сільвестровіч, паветовым начальнікам — Іван Каменскі. “Чырвоныя” ў Вільні зноў узмацнілі свой уплыў на ход паўстання, а сваімі зваротамі да сялянства імкнуліся актывізаваць яго ўдзел у барацьбе.

Царскія ўлады ў цэнтры і на месцах, выкарыстоўваючы тактыкі “бізуна і перніка”, “падзяляй і ўладар”, прымалі ўсе меры, каб не дапусціць пашырэння паўстання, утрымаць сялянскую масу ад выступлення. 1 сакавіка 1863 г. імператар Аляксандр ІІ выдаў указ, згодна з якім адмяняліся ў Беларуска-Літоўскіх губернях часовыя павіннасці сялян на карысць памешчыкаў, уводзіўся абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў, выкупныя плацяжы за атрыманую зямлю зніжаліся на 20%. Цар выступаў у якасці абаронцы сялян ад памешчыкаў і клапатлівага бацькі сваіх падданых, што паўплывала на паводзіны сялян.

(Працяг на 6-й стар.)

За волю!

(Працяг. Пачатак на 5-й стар.)

У канцы месяца, 31 сакавіка 1863 г., з'явіўся новы ўказ, разлічаны ўжо на ўсіх удзельнікаў паўстання: цар абяцаў памілаванне ўсім, хто да 1 мая пакіне "мяцежніцкія шайкі" і складзе зброю, з'явіцца да мясцовага начальства. Гэтыя ўказы вясной і на пачатку лета слаба яшчэ спрацоўвалі, таму што паўстанне было на ўздыме, і дапаўняліся жорсткімі карнымі мерамі. Генерал-губернатарам у Вільню з надзвычайнымі паўнамоцтвамі быў прызначаны Міхаіл Мураўёў — з тых Мураўёвых, па яго словах, *"якія вешаюць, а не з тых, каго вешаюць"*. Ён прыняў энергічныя і бязлітасныя меры па задушэнні паўстання і заслужыў мянушку "вешальнік". Гэтыя меры датычыліся як сялян, так і шляхты, памешчыкаў.

Зразу пасля прыбыцця ў Вільню М.Мураўёў 15 мая 1863 г. накіраваў гродзенскаму губернатару графу Бобрынскаму дасканала распрацаваныя і зацверджаныя царом правілы аб парадку накладання спагнанняў на мяцежнікаў. Усе паўстанцы: ад кіраўнікоў і асоб, захопленых са зброяй у руках, да саўдзельнікаў — падзяляліся на 5 катэгорый. І кожнай з іх была вызначана мера пакарання: ад расстрэлу да адпраўкі ў арыштанцкія роты. Удзельнікі паўстання, захопленыя ў палон у час баявых дзеянняў, расстрэльваліся без суда на месцы. Усім сельскім жыхарам, дзяржаўным службоўцам, памешчыкам было строга загадана выяўляць і неадкладна паведамляць уладам аб з'яўленні "мяцежніцкіх шаек", іх перамяшчэнні, аб асобых паўстанцах. У выпадку невыканання загада накладваліся штрафы на ўсіх жыхароў вёскі. Суровыя меры прымяняліся да памешчыкаў, якія дапамагалі паўстанцам харчаваннем, фуражом або інфармацыяй аб карніках ці не дакладвалі аб з'яўленні атрадаў у іх маёнтках.

Генерал-губернатар распарадзіўся, каб *"...к помещикам, которые снабдят когда-либо продовольствием мятежнические шайки или не предупредят ближайшие команды о нахождении шаек в их имениях, был со всей строгостью применен параграф 19 Инструкции для устройства военно-гражданского управления, т.е. чтобы на имения их немедленно был налагаем секвестр, а находящиеся в этих имениях хлеб, овес и прочие запасы были обращаемы на продовольствие войск, лошади и повозки на устройство перевозных средств. Самих же помещиков и управителей их брать под стражу и предавать военному суду, а семейства их немедленно удалять из имений"*.

Пры адыходзе сялян у паўстанцкія атрады ад іх адымалася зямля на карысць сельскай абшчыны, аб чым было аб'яўлена ва ўсіх валасцях з царкоўных амбонаў. У вёсках была арганізавана за грашовую плату начная варта жыхароў для папярэджання прыходу паўстанцаў і ўстаноўлена паштовая сувязь для перадачы інфармацыі аб іх з'яўленні.

У небяспечны і трывожны час асноўная сялянская маса, знаходзячыся пад наглядам паліцэйскіх чыноў, праваслаўных святароў, вагалася і чакала. Да яе з цяжкасцю даходзілі звесткі аб планах, рашэннях паўстанцкага кіраўніцтва. А мясцовыя ўлады, карыстаючыся недасведчанасцю сялян, настройвалі іх супраць "мяцежнікаў", "польскіх паноў", сеялі рэлігійную і нацыянальную варожасць. Ад іх патрабавалася сачыць за шляхтай, аканомамі, дворняй і даносіць начальству. Улада заахвочвала сялян на пошук і вылоўліванне паўстанцаў, за што ўстанавіла шчодрую плату: за выдадзенага начальству "мяцежніка" — 3 руб., за ўзброенага — 5 рублёў. Свае "срэбранікі" (па 3 руб.) атрымалі ў верасні 1863 г. жыхары вёскі Каўбасін Ф.Казукевіч і Стаповіч за тое, што злавілі і перадалі карнікам аднаго паўстанца. У гэты ж час у іншым месцы павета, паміж Луцкаўлянамі і Ярмолічамі, часова абавязаныя сяляне памешчыка Пуслоўскага І.Нярэль, Я.Ярусейка, А.Кабарда, І.Ярусейка вылавілі чатырох узброеных паўстанцаў і нядрэнна "зарабілі" (па 20 руб.). Такое ж адбывалася каля Сапоцкіна і ў іншых месцах.

Пад пільным наглядам расійская ўлада трымала каталіцкую шляхту, чыноўнікаў, вучнёўскую моладзь. Распараджэннем М.Мураўёва і гродзенскага губернатара было ўведзена абмежаванне на паездкі і перамяшчэнне жыхароў у межах павета і губерні. Ім было забаронена пакідаць месца свайго пастаяннага пражывання, а для паездкі патрэбна звяртацца па дазвол да ваеннага начальніка павета, указаўшы мэту паездкі, яе працягласць і месца накіравання. Забаронены былі і прыватныя грашовыя і матэрыяльныя зборы, сходы памешчыкаў і шляхты без адпаведнага дазволу. Нават на вяселлі пры выдачы замуж ці жаніцьбе дзяцей патрэбна было атрымаць дазвол для запрашэння сваякоў і суседніх памешчыкаў.

Але ўрад лічыў важнейшым эканамічны ціск на землеўладальнікаў: канфіскацыя зямельнай і нерухомай уласнасці, увядзенне штрафаў, пастойнай павіннасці, секвестр (забарона на карыстанне). Па царскім указе ад 15 сакавіка 1863 г. зямельныя ўладанні ўдзельнікаў паўстання або тых, хто дапамагаў "мяцежнікам", падлягалі канфіскацыі або секвестру без судовага рашэння. Так, тэрмінова былі канфіскаваны маёнткі

графа Леапольда Валіцкага — Азёры, 9140 дзес. зямлі,

Уладыслава Спірыдовіча — Навасёлкі, 703 дзес.,

Севярына Ромера — Губінка, 170 дзес.,

Аляксандра Абуховіча — Мігова, 480 дзес.,

Рудольфа Мантовіча — Астапкоўшчына, 141 дзес.,

Пятра Пакубяты — Заблаць і Русота, 393 дзес.,

Канстанціна Сапоцькі — Ласосна Сакольскага п., 294 дзес.,

хата ў Антона Качынскага, жыхара м. Азёры,

сядзіба і зямля (2,7 дзес.) Паўла Канстанціновіча ў ваколіцы Абуховічы.

Аб'яўлена аб канфіскацыі непадзеленых маёнткаў — тых частак, якія належалі "мяцежнікам":

Аляксандра Лянкевіча — Панюкі (сумеснае ўладанне з сям'ёй памерлага брата Антона),

Станіслава Сільвестровіча — Гожа і Пералом (сумеснае ўладанне з братам Казімірам),

Івана Каменскага — Мінявічы (сумеснае ўладанне з сёстрамі).

"Зачысткі"

Царская ўлада прыбегла і да спецыфічнай меры пакарання — "зачысткі" тэрыторы ад "мяцежных элементаў" з мэтай не толькі пакараць адных і запалохаць другіх, але і падрыхтаваць месцы для перасялення надзейных з цэнтральнай Расіі. Гэтая мера паспяхова выкарыстоўваецца і сучаснымі расійскімі ўладамі на Каўказе. Жорсткую расправу ў ліпені 1863 г. учынілі царскія карнікі з ваколіцай Шчукі Каменскай воласці Гродзенскага павета. Многія жыхары Скідзельскай, Каменскай, Мастоўскай валасцей спрыялі, дапамагалі паўстанцам атрада А.Лянкевіча, уступалі ў яго шэрагі, паведамлялі яму аб знаходжанні расійскіх войскаў, каралі здраднікаў за даносы карнікам. Аб падтрымцы жыхарамі паўстанцаў дакладаў у рапарце губернатару камандзір 3-га батальёна Неўскага пяхотнага палка маёр Крэмер, што 1, 2 і 3 ліпеня зборышча мяцежнікаў не адшукана. Па звестках, іх каля 120 чалавек з самых адчайных і добра ўзброеных, і больш тыдня яны канцэнтруюцца ў ваколіцах м.Каменка. *"Несмотря на настойчивое и совокупное преследование трёх отрядов невозможно было отыскать означенную шайку... мятежники пользуются как продовольствием, так равно всем необходимым для них из окрестных имений"*.

Актыўнасць паўстанцкага атрада, садзеянне яму насельніцтва выклікала ў расійскіх карнікаў і ўлады лютае жаданне расправіцца як з мяцежнікамі, так і з іх памагатымі, і яны шукалі для гэтага якую-небудзь падставу. І яна з'явілася. За супрацоўніцтва з карнікамі быў пакараны паўстанцамі селянін з вёскі Сарокі Іван Макарэвіч, якога яны ўжо папярэджвалі. Але тут ішла вайна, у якой гінулі яе ўдзельнікі з абодвух варагуючых бакоў, у тым ліку і іх памочнікі.

Улады выкарысталі гэты трагічны выпадак, каб расправіцца "для прыкладу другім" з шляхтай ваколіцы Шчукі, якую ўсю яны абвінавачвалі ў падтрымцы "мяцежнікаў" і расправе з селянінам Іванам Макарэвічам. Падазрэнне выпала на шляхціца Івана Шчуку, і ён быў арыштаваны і адпраўлены ў Гродна, але следства яго віны не раскрыла. Улады асабліва і не стараліся ў гэтай справе, яны рыхтавалі расправу. У Скідзель разам са следчай камісіяй накіраваўся ваенны начальнік г.Гродна і павета палкоўнік Вернер для разгляду інфармацыі аб паводзінах шчукінскай шляхты. У ваколіцу Шчукі ён паслаў скідзельскага прыстава з сялянамі *"з загадам даставіць у м.Скідзель усіх дваран названай ваколіцы"*, але яны не выканалі загада: шляхта, што касіла сенажаць, з пагрозамі збегла ў лес, а вёска пуставала, у ёй засталіся толькі чатыры старыя бабкі ў апусцелых хатах.

Палкоўнік Вернер тут жа 11 ліпеня праінфармаваў губернатара графа Бобрынскага аб удзеле ўсёй шчукінскай шляхты ў мецяжы і на наступны дзень атрымаў строгае прадпісанне:

"...предписываю Вашему Высокоблагородию самим... с ротою отправиться в Щуки и, убедившись в вчерашнем упорстве... собрать соседних крестьян, дворян, шляхту и в присутствии отряда прочесть сие мое предписание. Сжечь всю околицу Щуки, потом уничтожить решительно все следы бывшего селения, отдать земли соседним крестьянским обществам... Я особенно настаиваю на том, чтобы следов околицы Щуки не оставалось бы никаких... После сего, составив облаву из крестьян, следовало бы переловить бежавших".

З гэтым загадам губернатара палкоўнік Вернер на наступны дзень з ротай салдат і 15 казакамі рушыў са Скідзеля ў Шчукі, куды сабраў суседніх памешчыкаў, іх прыказчыкаў, сялян з суседніх вёсак Грамовічы і Сяльвяны, старшыну Каменскай воласці. Тут ён зачытаў вылаўленым шчукінскім жыхарам прадпісанне губернатара, патрабаваў пакаяцца і выдаць "мяцежнікаў". Але не дачакаўся пакаяння і загадаў салдатам падпаліць вёску. Калі некалькі хат рухнулі ў агні, адпусціў памешчыкаў і сялян, а сам з войскам стаў лагерам паблізу, *"абклаўшы паселішча ланцугом казакаў"*. А ў недалёкім лесе плакалі ад страху жанчыны і дзеці шчукінскай шляхты, назіраючы з жахам за пажарам, у якім гінулі ў полымі іх родныя хаты і шматгадовыя набыткі. Неўзабаве ўсе яны былі вылаўлены, далучаны да сваіх сем'яў, перапісаны і ўсе змешчаны як злачынцы пад варту пры Калужскім пяхотным палку.

У спіс для высылкі на пастаяннае жыхарства на казённых землях у цэнтральныя і ўсходнія губерні Расіі былі ўключаны (указаны галава сям'і, яго жонка, колькасць членаў сям'і, месца высылкі):

1. Шчука Мікалай, ж. Разалія, 5 чалавек — у Арэнбургскую губерню
2. Шчука Разалія, удава, 7 — Самарскую
3. Шчука Восіп, ж. Міхаліна, 7 — Пермскую
4. Шчука Вікенцій, ж.Міхаліна, 7 — Аланецкую
5. Шчука Восіп, ж. Саламея, 5 — Наўгародскую
6. Шчука Сымон, ж. Антаніна, 6 — Кастрамскую
7. Шчука Станіслаў, ж. Разалія, 4 — Валагодскую
8. Шчука Ігнат, ж. Вікторыя, 5 — Самарскую
9. Шчука Станіслаў, ж. Антаніна, 6 — Кастрамскую
10. Шчука Вінцэнт, ж. Тэафілія, 8 — Саратаўскую
11. Шчука Фадзей, ж. Антаніна, 6 — Тамбоўскую
12. Кузьміцкі Аляксандр, ж. Марцэля, 4 — Саратаўскую
13. Амбрусевіч Ігнат, ж. Марцыяна, 2 — Арэнбургскую
14. Амбрусевіч Антон, ж. Ганна, 10 — Пермскую
15. Шчука Мартын, ж. Францішка, 3 — Пензенскую
16. Шчука Ян, ж. Тэафілія, 4 — Томскую (сам Ян Шчука, абвінавачаны ў забойстве І.Макарэвіча, знаходзіўся ў Гродзенскай турме).

Спешна закруцілася рэпрэсіўнае кола бюракратычнай машыны, і 31 ліпеня 1863 г. былі адпраўлены ў С.-Пецярбург 76 чалавек, жыхароў ваколіцы Шчукі, а астатніх, пасля адшукання, высылалі пазней.

А на месцы, у спаленай вёсцы, па загадзе баявога палкоўніка Вернера салдаты і сяляне рыліся на папялішчах, шукаючы прыхаваныя ў ямах скарбы зняволенай шляхты, у лесе і наваколлі збіралі бяздомную жывёлу. Улада хацела паказаць, што яна не толькі карае, але і клапоціцца аб сваіх несвядомых грамадзянах. І таму ўсё сабранае на папялішчах: і жывёла, і гаспадарчы інвентар, і адзенне, і зерне — было прададзена на аўкцыёне, а выручаныя грошы (1748 руб. 94 кап.) перададзены ў Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў для размеркавання пароўну паміж вывезенымі сем'ямі. Праўда, улада выкарыстала трэцюю частку гэтых грошай для аплаты праезду высланых на новае месца жыхарства. І тут павінна панаваць справядлівасць: не можа дзяржава вазіць за свой кошт дзяржаўных злачынцаў. Няхай яны плацяць самі!

Трэба дадаць, што адасланыя грошы доўга не маглі адшукаць некаторых гаспадароў з-за блытаніны, дапушчанай чыноўнікамі пры адпраўцы. У спіс на высылку ўключылі толькі 13 сем'яў, а не былі ўнесены туды

1.Шчука Разалія (збегла з-пад арышту з малым дзіцем),

2.Шчука Ян (знаходзіўся ў турме),

Кузьміцкі Аляксандр (хаця вывезлі ўсю сям'ю).

(Працяг у наступным нумары.)

ВЕДАЙ НАШЫХ!

World of Tanks стала адной з самых прыбытковых анлайн-гульняў у свеце

Распрацаваная беларускай кампаніяй Wargaming гульня World of Tanks зарабіла летась 372 мільёны долараў.

Як інфармуе РБК, яна заняла чацвёртае месца сярод усіх анлайн-гульняў у свеце, якія працуюць па мадэлі free-to-play (карыстальнікі запампоўваюць гульню бясплатна, але плацяць за розныя артэфакты ўнутры гульні).

Wargaming была заснавана ў 1998 годзе. Лічыцца, што яе асноўны офіс знаходзіцца на Кіпры. Але пераважна кампанія працуе ў Беларусі, Расіі, Украіне і ЗША.

ЧУЛІ?

Таксі ўзнімае тарыфы

Незадаволеныя мінскія таксісты вымусілі дыспетчарскія станцыі ўзняць тарыф.

Гэта вызначана ў пагадненні, якое падпісалі кіраўнікі дыспетчарскіх станцый. Нагадаем, што на мінулым тыдні з'явіліся звесткі, быццам таксісты могуць застрайкаваць праз малыя тарыфы.

Як вынікае з тэксту дакумента, з 25 студзеня ніжняя планка тарыфу ўзнімецца да 4,4 тысячы рублёў за кіламетр, з 25 лютага — да 4,9 тысячы рублёў. А 25 сакавіка агучаць новы тарыф. Различыць яго дыспетчары папросяць спецыялістаў кампаній "Легаўтатранс", "Спецлегмантаж" і "Вектар Сэрвіс".

Дарэчы, сярэдняя колькасць заказаў, якую таксіст атрымлівае ад дыспетчарскай, — ад 5 да 8, сярэдні чэк — 50 тысяч. Падабраць кліента на вуліцы атрымліваецца 1—3 разы ў дзень, сярэдні чэк у гэтым выпадку — 100 тысяч рублёў. У дзень аўтамабіль таксі расходуе 10—15 літраў паліва.

ИНИЦИАТИВА

МЧС предлагает ввести наказание за выход на тонкий лед


*"Несмотря на предупреждения МЧС, белорусы продолжают гибнуть, проваливаясь под лед. Мы предлагаем установить ответственность за выход на лед во время ледостава и в период его таяния", — заявил министр по чрезвычайным ситуациям **Владимир Ващенко**.*

"*Необходимо разрешить на уровне местных властей устанавливать запрет на выход на лед, когда это небезопасно*, — цитирует министра interfax.by. — *Например, на неделю, пока лед не станет крепким. Здесь тот же принцип, что и в ситуации с запретом на нахождение в лесах, когда складывается пожароопасная ситуация*".

Вместе с тем он отметил, что министерство сталкивается с неприятием своей позиции в этом вопросе. *"Нам говорят, что в этом нет большой общественной опасности,* — рассказал министр. — *Мы так не считаем*".

По его мнению, *"если будет установлена ответственность, то можно будет убедить вышедших на лед вернуться на берег, наши граждане все же законопослушны". "Пока же мы никак не можем повлиять на тех, кто рискует своей жизнью, выходя на некрепкий лед, — никакой ответственности за это не предусмотрено"*, — говорит он.

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК


Фота Д. Кунстадтара

Кніга пра Хомку завершана

Сапраўды, вясёлая кніга пра Хомку завершана, бо займела свой уступ і апошнюю старонку, свой змест і назву.

Спадзяюся, кніга ўбачыць свет, а найбольш спадзяюся (безадносна ад таго, выйдзе яна ці не!), што ў беларускую літаратуру вернецца здаровы смех, лагодная іронія, ненатужная радасць.

Я мару, каб нашы маладыя творцы, адкінуўшыся ад згубнага "сцёбу", засвоілі класічныя традыцыі смеху, авалодалі эстэтыкай народнай весялосці, на якую багаты творы Янкі Купалы (раю перачытаць "Прымакоў" і "Тутэйшых") і Якуба Коласа, Кандрата Крапівы і Андрэя Мрыя, Рыгора Семашкевіча і Алеся Няўвеся...

А яшчэ мару, каб чытачы "Народнай Волі" заўсёды шукалі ратунак ад суму не ў гарэлцы і сварцы, а ў зычлівым вершы, уцешным апавяданні, прыемнай мелодыі.

Паважаныя сябры, шчыра жадаю вам у 2014-м залатога настрою!

І Хомка вам жадае таго ж!

Хомка думае

А начальнікаў без ліку!
Кожны — можны і герой!
На пасадзе ён вялікай,
Заўтра будзе на малой...

Хомка думае і — Божа! —
Горка робіцца Хаме:
"Заўтра той начальнік можа
Апынуцца і ў турме!"

Хомка і "блін"

Кажа Хомка: "От жа "блін",
Дурняў шмат, а я адзін!
І таму, што дурняў шмат,
Ужываю "блін" як мат!"

Хомка і сволач

Хомка ведае, што сволач
Смецце кідае — у Свіслач,
І таму ён просіць: "Свіслач,
Ты даруй, бо гэта ж сволач!

Зрэшты, каб я меў уладу,
Даў бы і такую раду:
Свалачэй (у сэнсе кары)
Хоць на дзень садзіць на нары!"

Хомка пра нефармат

На FM прыйшоў юнак —
Богам лашчаны спявак —
Ды пачуў там акурат:
"Вашы песні нефармат!"

Голас на любы харал,
Проста оперны вакал,
Галасоў такіх няшмат,
Толькі от жа — нефармат!

Засмуціўся той юнак
І сабе ўжо быў не рад,
Ды Хама суцешыў так
Юнака: "Паслухай, брат!

Плюнь на гэты нефармат!
На FM патрэбны блат,
Ножкі доўгія і нал,
А ніякі не вакал!"

Хомка і дурныя бацькі

І няўжо так быць павінна?
Свет настаў ужо такі:
Кожны дзень дзяцей няспынна
Пруць у школу на машынах
Неразумныя бацькі!

Мне ад смеху, шчыры Божа,
Не памерці б тут хаця:
У тралейбусе ж не можа
Ехаць роднае дзіця!

Маючы гадкоў шаснаццаць,
Сыкнуць можа гусаком...
Трэба даць яму па с...
Зранку і пагнаць пяшком!

Хомка наш пачухаў рэпу
І сказаў аб тым усім:
"Гэтак даць таксама трэба
І бацькам — такім дурным!"

Хомка і аграгарадок

Пуста ў аграгарадку,
Хоць і маляўніча...
Не падасць ніхто руку,
Выпіць не пакліча.

Каляровыя дамкі,
Як сіроты тыя,
А навокал сум такі,
Ажно сэрца ные!

У дварах расце трава...
Куры дзе? Дзе гусі?..
Многа аграхараства
Ў нас на Беларусі...

І Хаме яна няўсмак
Пустка-панарама,
Бо ніякіх тут сабак;
Сук няма таксама.

Хомка і "Еўрабачанне"

"Еўрабачанне", Еўропа...
Дурата над пустатой...
Нашым п'яўкам-асталопам
Добра з гэтай дуратой!

Як сыцеюць п'яўкі нашы!
Набіваюць поўны рот...
Усмакталіся (а як жа!)
"Еўрабачанню" ў жывот!

З беларушчынай па-свінску
Разамкнуліся: "Набок!.."
І якоча па-англійску
Іхні скрыўлены раток!

Хомка адчаканіў п'яўкам:
"А на мове на сваёй
Трэба размаўляць, і гаўкаць,
І спяваць, само сабой!"

Хомка і экалогія

"Ад ляноты і дурноты,
І свінячае натуры
Грамадзяне-ідыёты
Горы смецця навярнулі!

Хто закідаў цэлафанам
Край ад краю і да краю?
Ды нашчадкі партызанаў
І нашчадкі паліцаяў!

Па БТ — усё ў нас кветнік,
А прайдзі любым зацішкам:
Не зямля — суцэльны сметнік,
Не вада — рудая жыжка!.."

Хомка мовіў напаследак:
"Экалогія ні к чорту!
І за ўсё такое гэта
Даў бы кожнаму я ў морду!"

Хомка палахлівы

Калі ззаду пляшка звонка
Трэсне пад чыёй нагой,
Напалохаецца Хомка,
Спінку выгнуўшы дугой...

Супакоіўшыся, важна
Вочы выкругліць дзівак:
"Мне зусім было не страшна!
Проста выгнуўся я так!"

Хомка і будаўнікі

Забудаваць любы куток —
Сады, завулкі, плошчы,
Вады глыток, травы шматок
І неба край апошні!

Ёсць вольны бераг у ракі?!
Ён быў такі вякамі?!
Туды ідуць будаўнікі,
І бераг той знікае!

Хоць гістарычны цэнтр вакол —
Будаўнікам не сорам
Убіць у цэнтр вялізны кол
Паверхаў так на сорак!

Не вінаватыя яны,
Карміць жа трэба дзетак;
Няма й начальніцкай віны...
У нас — заўсёды гэтак!

І сніцца Хомцы ўсё часцей
Не сон, а нейкі морак:
Дзе быў Купалаўскі музей —
Стаіць гатэль "Пяць зорак"!

Хомка і Праўда

Хомку сціснуў лёгкі страх:
"Божа мой, і так бывае!"
Бачыць: Праўда ж у кустах —
Не газета, а жывая!

Слёзы ў Праўды той былі
І журба, і ўсё такое...
І ляжала на зямлі,
Роўна дыхала спакоем.

З выгляду была яна
Не сваёй і не чужою,
Як празрыстая сцяна,
Паміж целам і душою.

Хомка свой адолеў страх
І шапнуў сабе самому:
"Наша Праўда — у кустах...
Як забраць яе дадому?!"

Хомка і Шлёмка

Хомку ўбачыў хлопчык Шлёмка;
Крыкнуў бацьку: "Гэта Хомка!"
Адказаў тут бацька Шлёмку:
"Так, ты ўбачыў, Шлёмка, Хомку!"

Хомка і рыбакі

Сярод Свіслачы сядзелі
На ільдзіне рыбакі;
Налавіць яны хацелі
Рыбы пасярод ракі.

Свіслач — бедная такая —
Ім спрыяла, як магла;
Рыбка бралася малая —
Ну, якая ўжо была!

Рыбакі не наракалі
І, як мае быць, пад лёд
Моўчкі вуды закідалі —
Бо цярплівы ўсё ж народ!

Рыбакі сказаць маглі бы,
Каб спытаўся хто парой:
"Нам не трэ вялікай рыбы,
Хопіць рыбы і малой!.."

Турыстычны нейкі немец
Рыбу ацаніў: "Ніхт гут!"
І ніяк не мог укеміць:
"Ну, чаму такі тут люд?"

А Хама сказаў тым часам:
"Ой, няцямлівы які...
Людзі з нашага Калгаса!
Беларусы-рыбакі!"

Хомка і Бык

Генерал-палкоўнік Бык
Службы патаемнай
Вербаваць агентаў звык
З публікі багемнай.

Неяк з працы пёр дамоў
І Хаму пабачыў,
І размову з ім завёў
Проста, па-сабачы.

То ды сё... І сяк, і так...
Хомцы Бык балакаў,
Што ён ведае сабак,
Што і сам сабака.

А пасля прыцішыў бас
І шапнуў употай:
"Ты прыходзь, Хама, да нас...
Знойдзецца работа!"

Хомка толькі ікнуў: і...
Службе абалдую:
"Не з багемы я — з сям'і,
Так што не прыйду я!"

Хомка і дудка

Пэўна ж, нейкія музыкі...
Пэўна ж, выпілі яны...
Бо згубілі чаравікі,
Інструменты і штаны!

І дабро гарой ляжала,
І з яго, як навіну,
Хомка выцягнуў памалу
Дудку спеўную адну.

І зайграў, стуліўшы вочы,
Не па нотах, а на слых,
Нібы толькі што ён скончыў
Курс па класе духавых.

Музыкі такой ніколі
Аніхто яшчэ не чуў...
Хомка радасны паволі,
Як умеў, у дудку дзьмуў!

Так, наш Хомка не музыка...
Мае футра, а не фрак...
О, такой бяды вялікай,
Так ён грае ці не так!

Як дайграў, сказаў ціхутка,
Рады смеласці сваёй:
"Бачу — пад штанамі дудка!
Ну, дык і зайграў на ёй!"

Хомка і бігборды

Хомку дзіва: скрозь бігборды,
У бігбордах — цэлы свет,
А сваёй не бачыць морды —
Хоць маленечкі партрэт!

То банкіры-хакеісты,
То штаны, то паліто,
Безгалосыя артысты —
На бігбордах абы-што!

Там ні фарбы паэтычнай,
Ні ратунку ад нуды...
Роднай мовы блісне знічка,
Як заўжды, гады ў рады...

— Так, шаноўныя бігборды,
Будзьце там, дзе і былі;
Для маёй французскай морды
Месца вы не прыпаслі!

Хомка і пекінес

Бег наш Хомка ў цёмны лес,
А за Хомкам — пекінес!

Хомка ж раптам з мінай строгай
Нешта ўспомніў неўпапад,
Пекінесу даў дарогу
І пабег сабе назад!

І без Хомкі пекінес
Сам пабег у цёмны лес.

Хомка і ПЭН-цэнтр

У ПЭН-цэнтр падаў заяву
Хомка, робячы акцэнт,
Што даволі на халяву
Розных прынялі ў ПЭН-цэнтр!

Я ж не розны, я — адзіны,
Я — Хама, якіх няма;
Я ў ПЭН-цэнтры быць павінны;
Я ж — паэзія сама!

Я — і месяц, я — і сонца...
І паэт Дранько-Майсюк
Піша пра мяне бясконца!
І не ў стол — піхае ў друк!

У ягоным кожным слове —
То смяюся, то гуду...
Як правалiце, панове,
Я ў БРСМ пайду!

Хомка і пірагоўня "Штоле"

Хомка ў пірагоўню "Штоле"
Па адзін пірог зайшоў...
Пірагоў было даволі,
Самых розных пірагоў!

З рыбай, яблыкамі, мясам
І грыбамі, курагой,
І з брусніцамі тым часам...
Выбірай, Хама, не стой!

А яшчэ з цыбуляй хрусткай
І трусяцінай былі,
І з чарніцамі, капустай —
Напяклі дык напяклі!

Выбіраючы паволі,
Уздыхаў Хама, як мог:
"Нельга ў пірагоўню "Штоле"
Па адзін ісці пірог!"

Хомка і Ленін

"Не злічыць усіх зараз! —
Хомка ў недаўменні. —
Столькі ленінаў у нас!
Што райцэнтр — то Ленін!

Ці мястэчка, ці сяло,
Ці якая вёска...
Ленінаў, як і было, —
Засталося войска!

Словам, як тут ні круці
У душы ці ў сэрцы —
Ленінаў хоць гаць гаці
З кепкаю і ў кепцы!

Ленін скрозь — ад "а" да "я",
Хоць завязвай дзверцы...
Нават вуліца мая
Леніна завецца!"

Хомка і смецце

Звычка ёсцека дурная,
З ёй не змірыцца, я знаю,
Родны Хомка нізашто:

"Той, хто смецце раскідае,
За сабой не прыбірае —
Дурань той і больш ніхто!"

Хомка і тыя, што сварацца

Пасварыцца...
Памірыцца —
На хвіліну ці на дзве...
Зноў раптоўна пасварыцца
Аж да стуку ў галаве!

І з якой такой прычыны —
Ці вялікай, ці малой —
І мужчыны, і жанчыны
Сварацца?
Ды ні з якой!

Нехта скажа: "Гэта нервы..."
Можа, нервы, можа, не...
Можа, знікла міласэрнасць
У калгаснай старане?!

Хомка ж гэтак маракуе,
Думаецца так яму:
"Проста розуму бракуе —
От і сварацца таму!"

Хомка і прэмія Гедройца

Неяк бегучы дахаты,
Хомка ўбачыў тройцу —
Гэтых самых, лаўрэатаў
Прэміі Гедройца.

Ім, аб чым і гаманілі,
Куш багаты выпаў,
І журы яны хвалілі
За сумленны выбар.

Без натугі, без ніякай,
Лішніх слоў ніякіх
Пахвалілі і палякаў:
"Малайцы, палякі!"

І сябе, так — асцярожна
І нібыта жартам:
"Гэтай прэміі з нас кожны
Сто пудоў, як варты!"

...Супакоіліся нервы,
Шчасцейка займелі, —
Што патрэбнае і ў тэрмін
Друкануць паспелі!

Хомка і тапкі

Дзядзькі-цёткі носяць тапкі
І дзядулі ўсе, і бабкі;
Дзеці ўсе і таты-мамы
Носяць той абутак самы —

Зручны, мяккі, ноские, ходкі...
А Хама не носіць тапкі,
І таму пасля праходкі
Выціраюць Хомку лапкі.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Інжынер несавецкай душы

Днямі па афіцыйных СМІ прабегла чарговая хваля, мэтай якой было паказаць, што найвышэйшыя ўлады краіны "таксама клапоцяцца" пра духоўнасць нашых грамадзян і "таксама думаюць" пра беларускіх літаратараў. У прыватнасці, чарговая прэмія, асвечаная імем Самога, была ўручана паэту і галоўнаму рэдактару дзяржаўнага часопіса "Полымя" Міколу Мятліцкаму. Фармальнай нагодай прысуджэння гэтай прэміі стаў выхад у выдавецкім доме "Звязда" кнігі "Пад крыламі Дракона: Сто паэтаў Кітая", у якой сабраны пераклады твораў кітайскіх паэтаў ад старажытнасці да нашых дзён. Пра якасць гэтых перакладаў вялікага кітаязнаўцы Мятліцкага мне ўжо даводзілася пісаць на старонках "Народнай Волі", паўтарацца не буду. Чамусьці мне здаецца, што Мікола Мятліцкі атрымаў з рук Аляксандра Лукашэнкі прэмію зусім не за пераклады, зробленыя немаведама з якой мовы. Напэўна, найвышэйшага кіраўніка куды болей прывабілі неаднаразова публікаваныя ў дзяржаўных выданнях вершы, у якіх Мікола Мятліцкі захапляецца "чысцінёй і справядлівасцю" цяперашняй улады і з непадробным пафасам ставіць да ганебнага слупа "прагнілы і варожы Захад". Можна сабе ўявіць, якой крывёй і потам яму, колішняму выпускніку філфака Гомельскага ўніверсітэта, даваліся гэтыя шэдэўры: кар'ера Мятліцкага складаецца са шматгадовай нястомнай працы ў розных літаратурных рэдакцыях. Дарэчы, у даўнія ўжо гады Мятліцкі быў добра знаёмы з выпускніком таго самага ўніверсітэта, цяперашнім палітвязнем Алесем Бяляцкім. На пачатку 1990-х гадоў Бяляцкі стаў адным са стваральнікаў і першым дырэктарам мінскага Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, які цяпер "клапатлівыя" ўлады вырашылі ліквідаваць як самастойную ўстанову. Мікола Мятліцкі тады быў сціплым выдавецкім рэдактарам, які чакаў свайго часу — і ўрэшце дачакаўся. Што праўда, з вышыні сваёй цяперашняй стратэгічна важнай дзяржаўнай пасады яму цяжка разгледзець праблемы таго самага музея ці таго самага Бяляцкага...

Мае сённяшнія нататкі, аднак, прысвечаны не Міколу Мятліцкаму, а сапраўды высокаталенавітаму літаратару, празаіку, чыя сціплая асоба не мільгаціць на старонках СМІ. Завуць гэтага празаіка Вінцэсь Мудроў, жыве ён у сваім родным Полацку. Яшчэ ў канцы 70-х гадоў мінулага стагоддзя ён, сын былога вайскоўца, рускага па нацыянальнасці, знайшоў літаральна на сметніку сціплы зборнічак паэзіі Багдановіча і... закахаўся ў беларускую літаратуру. Першыя спробы яго — як і яго калегі-аднакласніка, будучага знакамітага творцы Уладзіміра Арлова — літаратурнай творчасці былі звязаны з нелегальным "Блакітным ліхтаром", усе нумары якога пазней былі канфіскаваны "літаратуразнаўцамі ў цывільнай вопратцы". Але Вінцэсь Мудроў паспеў атрымаць дыплом інжынера, і яго працоўная біяграфія тады не перапынілася: краіне Саветаў усё-такі былі патрэбны спецыялісты нафтагазавай індустрыі і ў Беларусі, і на ўсіх велізарных абшарах былой імперыі. Ды нават працуючы ў далёкай Цюменскай вобласці, Вінцэсь Мудроў не кінуў пісаць свае адметныя і непаўторныя апавяданні і аповесці, у якіх бліскуча выявіў свой талент — някідкімі, але каларытнымі мазкамі вымалёўваць душу "гома саветыкуса". Пасля Вінцэсевага вяртання на радзіму пачалі з'яўляцца і першыя ўжо непадцэнзурныя публікацыі, дзе героямі заставаліся ўсё тыя самыя тыпажы — гараджане першага пакалення: вані бяньковы, лёшкі мандрыкі, суровыя гарадскія дапільноўшчыкі правільнага савецкага жыцця фарзуны... Гэтых самых герояў мы сустракаем і на старонках найноўшай кніжкі мікрааповесцяў і апавяданняў Вінцэся Мудрова "Багун", што выйшла з друку напрыканцы мінулага года дзякуючы прыватнай ініцыятыве "Полацкае ляда". Як на маё разуменне, у гэтай кнізе аўтар не толькі зрабіў новы крок у літаратурным асэнсаванні савецка-беларускай ментальнасці, але і паспрабаваў дакапацца да яе каранёў. Героі апавяданняў "Раніцай, калі патухаюць зоркі" і "Багун" жывуць у пераломную эпоху далучэння Заходняй Беларусі да БССР, а героі аповесці "Калодзеж" выходзяць на сцэну ў гады Другой сусветнай вайны. Дазволю сабе тут толькі адну цытату з першага з названых твораў:

"...Ідучы да хаты, Багун з Хамёнкам чухалі патыліцы, штохвілі ўздыхалі.


— І як яно ўсё будзе? — прамармытаў Багун, на хаду прыпальваючы цыгару.

— Ды неяк будзе, — Хамёнак таксама чыркнуў запалкай, — палякі панавалі, цяпер Саветы запануюць. Прыйдуць кітайцы — мы і пад імі ўжывёмся, жаб будзем жэрці ды па-кітайску балабоніць.

— Яно так, — пагадзіўся Багун і хутка азірнуўся..."

На сапраўдны шэдэўр сучаснай сатырычнай літаратуры выглядае апавяданне Вінцэся Мудрова "Іду на таран!", якое друкавалася ў незалежнай перыёдыцы яшчэ ў другой палове 1990-х гадоў, але толькі цяпер трапіла на старонкі кніжнага выдання. У афіцыйных беларускіх СМІ не раз даводзілася чытаць пра абвяшчэнне літаратурных конкурсаў на найлепшыя творы, прысвечаныя беларускай арміі. Напэўна, былі ў гэтых конкурсах нейкія лаўрэаты, пераможцы, але сказаць, каб айчынная літаратура пасля ўручэння гэтым пераможцам адпаведных узнагарод сапраўды пабагацела, ніяк не магу. А вось мудроўскі "Іду на таран!" варта было б прачытаць сённяшнім міністру абароны, сакратару саўбеза, усяму беларускаму генералітэту. І, калі гэтыя асобы напраўду маюць пачуццё гумару, яны шмат што і шмат каго ў гэтым творы пазнаюць. Бо душу беларускага вайскоўца тут даследуе інжынер-тэхнолаг паводле дыпломнай спецыяльнасці і інжынер несавецкай душы паводле паклікання, таленавіты палачанін Вінцэсь Мудроў...

Лявон БАРШЧЭЎСКІ.



ЗАПРАШЭННЕ

24 студзеня ў Мінску адбудзецца прэзентацыя кнігі Вінцэся Мудрова "Багун".

У імпрэзе возьмуць удзел:
- Уладзімір Арлоў
- Лявон Баршчэўскі
- Пятро Васючэнка
- Алесь Аркуш
- Таццяна Козік
- Ігар Палынскі (лідар гурта Sumarok)
- гурт "Кашлаты Вох".

Пачатак імпрэзы а 19-й гадзіне. Уваход вольны.

ВЕРНІСАЖ

«Белгазпрамбанк» набыў на аўкцыёне Christie's працы трох беларускіх мастакоў

Гэта Леў Бакст, Дзмітрый Стэлецкі і Леў Індэнбаум. Працы гэтых майстроў упершыню з'явяцца ў Беларусі.

Леў Бакст і Дзмітрый Стэлецкі (нароўні з Рэрыхам, Бенуа, Сомавым) з'яўляюцца прадстаўнікамі мастацкага аб'яднання "Свет мастацтва".

Ураджэнец Гродна Леў Бакст сёння прызнаны адным з самых дарагіх тэатральных мастакоў у свеце, нагадвае tut.by. Ён праславіўся дзякуючы афармленню спектакляў трыумфальных "Рускіх сезонаў" Дзягілева. Разам з кампазітарам Стравінскім Бакст аформіў серыю балетных пастановак, якія прынеслі абодвум сусветную вядомасць. Эскіз гарнітура да аднаго з іх — "Жарптушка" — зараз у калекцыі "Белгазпрамбанка".

Брэстаўчанін Стэлецкі з 1914 года жыў у Парыжы, дзе распісваў праваслаўныя храмы, афармляў спектаклі па матывах рускага фальклору. Банк купіў яго карціну "Ноч Святога Яна".

Скульптар Леў Індэнбаум нарадзіўся на Магілёўшчыне, жыў і вучыўся ў Вільні, а ў 1911 годзе пераехаў у Парыж. Сярод яго сяброў былі Суцін, Дыега Рывера, а Мадзільяні пісаў яго партрэт.

ДЫЯГНАЗ

Спявачка Жанна Фрыске хворая на рак

Аб гэтым паведамляецца на афіцыйным сайце артысткі.



Хваробу вядомай спявачкі пацвердзіла яе сям'я, выступіўшы з афіцыйнай заявай. Блізкія просяць паставіцца з разуменнем да сітуацыі. Грамадзянскі муж і бацька дзіцяці Жаны Фрыске беларус **Дзмітрый Шэпелеў** знаходзіцца ў гэтыя хвіліны побач з ёй.

"Тое, што доўгія месяцы заставалася выключна справай нашай сям'і, на жаль, некалькі дзён таму стала грамадскім здабыткам. Пры гэтым мы хочам спыніць любыя спекуляцыі і лічым, што прыхільнікі і неабыякавыя да Жанны людзі маюць права ведаць праўду. Нашай сям'і выпала суровае выпрабаванне.

Жанна хворая на рак, мы працягваем змагацца за яе і ні на хвіліну не перастаем верыць. Мы звяртаемся да ўсіх з адзінай просьбай падтрымаць нас добрым словам і малітвай.

У бліжэйшай будучыні мы хацелі б устрымацца ад каментарыяў, для таго каб неўзабаве вярнуцца да вас, я спадзяюся, з добрымі навінамі. А зараз просім даць нам засяродзіцца на адзіна галоўным — здароўі і жыцці Жанны. Пажадайце нам дабра", — сказаў Дзмітрый Шэпелеў.

КУЛУАРЫ

«Без цябе, Таццяна, мне не ў радасць чарка...»

У мінулую нядзелю ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі адбылася юбілейная вечарына, прысвечаная 75-годдзю народнай артысткі Таццяны Мархель. Павіншаваць актрысу прыйшлі калегі не толькі са сталічных тэатраў.

Пачалася імпрэза ўрыўкам са спектакля "Трыбунал". Пакуль актрыса пераапраналася, публіке дэманстравалі ўрыўкі з фільма пра яе. Варта адзначыць, што Мархель у жыцці даўно размаўляе выключна пабеларуску, таму вельмі рэзаў слых рускі закадравы тэкст, пры тым што сама актрыса распавядала пра сваё жыццё на мове.

Пасля некалькіх выхадаў юбіляршы на сцэну ў розных вобразах амаль адразу пачалася віншавальная частка. Мархель, седзячы ў высокім крэсле, нібы каралева, прымала віншаванні і падарункі.

Паводле сцэнарыя вечарыны, чаргу тых, хто будзе віншаваць Мархель, вырашылі складаць праз фанты. Выцягнуўшы з цыліндра першы фант, вядучы імпрэзы ўсклікнуў: *"Дзіва, дый толькі!"* Дакладна не вядома, што было напісана на паперцы, аднак першым на сцэну запрасілі міністра культуры **Барыса Святлова**. Барыс Уладзіміравіч са сцэны ад сябе ніякага падарунка актрысе не зрабіў, а толькі зачытаў прывітальны адрас ад імя А.Лукашэнкі. Актрыса перед прамовай міністра спачатку хацела ўстаць з крэсла, але чыноўнік махнуў рукой: *"Сядзіце!"* Потым на сцэну вынеслі невялікі букет — аб'явілі, што гэта кветкі ад кіраўніка дзяржавы.

"Думаю, гэта добры пачатак", — філасофскі заўважыла актрыса пасля прамовы міністра.

Дэкан тэатральнага факультэта Акадэміі мастацтваў **Уладзімір Мішчанчук** адзначыў, што яны з Таццянай Мархель даўно сябруюць, і разам з жонкай падараваў юбіляршы цудатворную ікону маці Боскай.

Акцёры **Эмілія Пранскутэ** і **Уладзімір Варанкоў** разам са сваімі лялькамі з "Калыханкі" і Маляванычам — акцёрам **Аляксандрам Ждановічам** назвалі Мархель і *"хлопцалюбнай"*, і *"ератычнай", і "ах, якой актрысай".* Але напрыканцы іх выступлення апладысменты сарвала сама Мархель, якая на манер беларускай народнай песні праспявала *"Хэпі бёздэй ту ю!".*

Былы мастацкі кіраўнік РТБД **Валерый Анісенка** і старшыня Саюза кінематаграфістаў **Віктар Васільеў** віншавалі народную артыстку песнямі. Анісенка пранікнёна выканаў "*Когда проходит молодость",* а Васільеў — *"Эти глаза напротив".* З апошнім Мархель нават крыху павальсіравала. Але за кулісы Мархель усё ж такі сышла не з імі, а з маладым хлопцам — прыгожым акцёрам РТБД **Дзянісам Паршыным**, які, відаць, прывабіў актрысу не толькі гітарай... *"Таццяна Рыгораўна, вы што, вярніцеся, госці яшчэ не разышліся!"* — жартам спынiў народную артыстку адзін з вядучых імпрэзы.

Ад Купалаўскага тэатра Таццяну Мархель віншавалі **Віктар Манаеў** і **Мікалай Кучыц**. Яны заўважылі, што Мархель — *"жвавая, як і шмат гадоў таму"*, і што яна ніяк *"не хоча старэць".* Віктар Манаеў узгадаў, як разам з Таццянай Рыгораўнай быў у Венецыі і тая, плывучы на гандоле, раптам *"на ўсю Венецыю зацягнула беларускую народную песню".*

"Без цябе, Таццяна, мне не ў радасць чарка, ну а з ёй — і скварка", — сказаў Мікалай Кучыц. Купалаўцы прынеслі актрысе, якая нарадзілася на Вадохрышча, *"святой вадзіцы з чыстай крыніцы, бярозавы венік — каб цэлы год парылася і ніколі не старылася, агурочкі з дубовай бочкі і шматок сала".* І ў дадатак уручылі *"печку-варку".*

Старшыня самага багатага на таленты прафсаюза культурных работнікаў **Наталля Аўдзеева** ні з таго ні з сяго са сцэны заўважыла: "*Дзякуй Богу, вас ніколі не выключалі з нашага прафсаюза..."* Яна прысвяціла актрысе свае вершы, якія абгарнула ў рамку, нібыта карціну.

Клуб "Таленты і прыхільнікі" прэзентаваў Таццяне Мархель вязанага анёла-ахоўніка.

Мастацкі кіраўнік Тэатрастудыі кінаакцёра **Аляксандр Яфрэмаў**, дзе адзін час працавала Мархель, слушна заўважыў, што Мархель — сапраўды народная актрыса. І гэтая народнасць праяўляецца не толькі вонкава. *"Народнасць — гэта ж не проста хустка, завязаная на сялянскі манер, народнасць — гэта калі да чалавека ўзнікае пачуццё абсалютнага даверу",* — сказаў ён.

Фінальным і вельмі пазітыўным было віншаванне ад трупы РТБД. А пасля Таццяна Мархель зрабіла ўсім гледачам падарунак — спела "Калыханку" і прамовіла: *"Сустрэнемся ў тэатры!"* А публіка яшчэ доўга пляскала ў далоні, не адпускаючы юбіляршу са сцэны і завальваючы яе кветкамі...

Марына КОКТЫШ.



ПЕРСОНА

Мария ГУЛЕГИНА:

«Люблю петь босиком»

Звезда мировой оперы, заслуженная артистка Беларуси Мария Гулегина в интервью belcanto.ru рассказала, что такое оперное счастье и как едва не погибла на сцене...

— Для вас существует идеал в опере?

— Конкретного идеала нет, но есть некий собирательный образ, выстраиваемый в голове. В Библии сказано: "Не сотвори себе кумира".

Нет универсального исполнителя, который может все одинаково потрясающе петь. Да и вкусы меняются.

Когда выхожу на сцену, то каждый раз должна выложиться, как в первый и последний раз. И если сильные коллеги, то спектакль только выигрывает. К сожалению, из-за кризиса или других причин сегодня не всегда могут собрать состав одного уровня.

— Что для вас оперное счастье?

— Счастье — когда стоячая овация. Когда знаешь: все получилось, прошла, прожила, и голос не сорвался от эмоций.

— А ужас?

— Когда тебе аплодируют, а ты знаешь, что там смазала, там дыхание перехватило, там эмоции захлестнули. Все хлопают, но жить не хочется — стыдно. Идешь домой и переслушиваешь. Если есть запись — смотришь, анализируешь, не спишь.

— Голос часто срывается?

— Бывает, от эмоций. Записать в студии можно даже кошку. Есть знаменитый анекдот про пианиста, которого попросили сыграть хроматическую гамму, а потом звукоинженер мог сделать из этого любое произведение.

Голос живой: он должен звучать и вибрировать в акустическом зале. Когда знаешь, что он споет здесь эту фразу так, здесь шумно возьмет дыхание, сделает нюанс ради нюанса — выходит самолюбование, мертвое пение.

— Ради проживания образа вы способны потерять голову?

— В "Сельской чести" у меня как-то вырвался крик в проклятии Турриду. Там можно было его пропеть, но тогда получилось бы фальшиво по эмоциям. Я крикнула, и голос сел: пришлось допевать оперу очень мягко. Все потом подходили и говорили: "Какое было пиано..."

А в Мариинке-2 перед сценой сомнамбулизма я чувствую какую-то фальшь. У меня каблуки — 12 см. Какой сомнамбулизм? Допустим, если Леди в стадии амбиций: одного убила, другого — это одно дело, тогда высоченные статусные каблуки дают опору. А тут ведь у Леди сознание, как будто ее череп лопнул, — наступает абсолютный крах. Я тут же их сняла и пошла босиком.

Если честно, люблю петь босиком в спектаклях: в сценах смерти, например, в "Набукко". На сцене для меня важно всё. Даже цвет глаз меняла линзами: у Манон — синие, у Маддалены — зеленые.

Всё меняется от состояния героини. И это не только внешние факторы: они дают возможность раскрыть образ пластически.

— Со сцены другое ощущение.

— Обидно, когда тебя не понимают... Как у Шаляпина в "Думе и маске": он плакал, а в зале смеялись. Он пел с холодной головой — все рыдали от его исполнения.

— Вы можете петь с холодным рассудком?

— Нет, хоть убейте. В "Чио-Чио-сан" Пуччини я всегда рыдаю. В "Аве Мария" Каччини слезы катятся буквально с первых нот. Во всех моих ролях есть совершенно разные моменты чувств и эмоций. В этом самое интересное живого оперного театра. Не мертвых записей, вычищенных техниками.

— Говорят, сколько дирижеров — столько подходов.

— С маэстро Мути всегда ощущаешь себя не примадонной, а ученицей, и в этом счастье. Приходишь на репетицию, как на экзамен: начинаешь эмоционально петь — и он все точно-точно выверяет. А на следующей репетиции — ты уже должна петь все точно, но с эмоциональной наполненностью.

По количеству комплиментов Джеймс Ливайн — рекордсмен среди дирижеров. Но с ним нужно особенно репетировать, не слушать комплименты, а работать, запоминать и наполнять состоянием. А Зубин Мета мне как-то сказал: "Со мной не вместе просто быть невозможно".

С Валерием Гергиевым не репетируешь — и получается вместе, даже лучше, чем бывает с другими дирижерами после месяца репетиций. Он интересно так: прилетает, улетает. Потом открывает партитуру: и чудо!

— Трудно держать себя в тонусе?

— Не очень просто. Легче всего петь то, что удобно. Сложнее, как лягушка, которая взбивала масло, стучать лапками постоянно, если у тебя нет спасительной руки, которая достанет из бочонка.

— У вас есть PR-агент?

— Пробовала взять его в 1990—1992-е годы, но, когда мне сказали, что надо идти с собакой в церковь, отказалась.

В 1998 году предложили выйти на красную дорожку с принцем Альбертом. А в это время у меня была репетиция "Манон Леско" с маэстро Мути. И как я скажу: "Вы знаете, у меня сегодня красная дорожка, а вы там сами как-нибудь"? Мне даже в голову такое не могло прийти.

Один прекрасный PR-агент хотел, чтобы у меня была фотография с Жаком Вильнёвом на капоте его машины. "Люди, у меня ребенок растет! Что я дочери скажу?" Наташе в это время было лет 13—14. Так что ничего не получилось, и всё время я крутилась сама. Нас так воспитывали педагоги, что стыдно себя пиарить, главное — петь.



— На вашем пути встречались хорошие коллеги?

— Да, помню Лео Нуччи. Я пела Абигайль и так сильно просила прощения у Иеговы и народа, что заползла за черту железного занавеса. А Лео выдернул меня, как куклу, и от смерти спас. Пласидо Доминго — гениальный: как коллега и директор. Благодаря ему я дважды возвращалась на сцену.

— Сегодня в опере не помогают?

— Сейчас каждый сам за себя. Такого нет, чтобы кто-то сильно переживал, как его коллеги будут петь. Некоторые новые звезды даже стараются, чтобы в их спектаклях все остальные были послабее.

Однажды после падения с лошади у меня выбился локтевой сустав, и мне надели фиксатор, с которым на сцену я не могла выйти. Через три дня в Гамбурге мне надо было петь. Предупреждали коллегу, чтобы она не хватала за руку. А она в середине дуэта со всей силы... Я чуть в обморок не упала от болевого шока, но не подала виду. Когда потом зашел директор и сказал ей "Что ты сделала?", она ответила: "Ничего, я за похороны заплачу". Это был 1992 год; певица, с которой я уже больше никогда не встречалась на сцене. Бог всё видит...

ВЕРИТЬ, НЕ ВЕРИТЬ

Гороскоп здоровья на 2014 год

В плане здоровья главная особенность 2014 года — это заметный диссонанс между высоким внутренним тонусом и душевной пассивностью. С одной стороны, звезды наделяют всех нас высоким жизненным потенциалом, однако сам по себе этот потенциал не раскроется. Это можно сравнить с богатейшим месторождением полезных ископаемых, которое часто бывает невидимо и скрыто под напластованиями пустой породы, зато уж если у вас получится добраться до его несметных ресурсов, то внакладе вы не останетесь!

В силу этого диссонанса в первой половине 2014 года многие могут ощущать регулярные приступы ипохондрии. В этом состоянии крайне нежелательно прислушиваться к всевозможным тревожным симптомам и тем более выискивать описание заболеваний в медицинских справочниках и на интернет-сайтах. Осторожнее! Поддавшись собственной мнительности, вы рискуете нафантазировать (а фантазии в 2014 году будут отличаться повышенной яркостью!) множество несуществующих заболеваний. Все это может очень негативно отразиться на вашем реальном здоровье, в первую очередь на заболеваниях сердечно-сосудистой, пищеварительной и нервной систем.

Если же вас действительно беспокоят какие-либо явные симптомы, ни в коем случае не стоит заниматься самолечением. Наилучшим решением будет обратиться не к справочникам, а к хорошему специалисту.

Ну а для того, чтобы максимально использовать щедрый потенциал 2014 года, помните, что ключ к хорошему самочувствию в наступающем году — это умеренный фитнес и легкая физкультура, причем ключевыми словами здесь являются “умеренный” и “легкая”. Не ставьте перед собой сверхзадач. Огромную пользу в 2014 году вам принесут ежедневная зарядка и дыхательная гимнастика, которые придадут энергии и позволят раскрыть богатые внутренние резервы организма, в том числе и резервы иммунной системы.



Овен

Для Овна в плане здоровья 2014 год обещает быть не хуже предыдущего, все зависит от того, как сам Овен отнесется к своему самочувствию. В первой половине года есть большая вероятность того, что Овен будет делать из мухи слона, преувеличивая важность даже самых небольших симптомов или же и вовсе выдумывая их. Из-за своих тревог и опасений он может чувствовать себя не лучшим образом, но его самочувствие быстро пойдет на поправку, если Овен сумеет избавиться от мнительности и взять себя в руки.

В остальном же первая половина 2014 года предоставляет ему все возможности для того, чтобы начать эффективное лечение заболеваний желудочно-кишечного тракта (если, конечно, такая необходимость назрела). А вот вторая половина года как нельзя лучше подходит для лечения и укрепления сердечно-сосудистой системы. Здоровому Овну в этот период звезды гороскопа советуют не пренебрегать аэробными нагрузками — они помогут ему укрепить свое сердце, стать выносливее и сильнее.

Телец

Для Тельца первая половина 2014 года может быть отмечена некоторой вялостью, пробоями в иммунитете и, как следствие, досадными недомоганиями. Длящийся целую неделю насморк, вялотекущие простудные и вирусные заболевания — все это способно стать для Тельца визитной карточкой зимы-весны 2014 года.

Чтобы поправить свое здоровье, Тельцу придется лечить не только конкретные болезни, но и их причину, т.е. всеми силами укреплять иммунитет. Активный образ жизни, витамины, свежий воздух, зарядка по утрам и позитивный настрой не оставят места для зимней хандры и помогут Тельцу в 2014 году сохранить отличное самочувствие. Впрочем, звезды гороскопа предупреждают Тельца и о том, что не стоит слишком зацикливаться на оздоровлении. В этом заключается еще одна особенность года: Тельцу следует помнить, что все хорошо лишь в меру и главный залог здоровья в 2014 году — гармония и внутреннее равновесие.

Близнецы

Главная особенность гороскопа здоровья Близнецов в 2014 году — это то, что практически весь год им придется уделять внимание правильному питанию. Неважно, хотят Близнецы этого или нет. Возможно, для любителей здорового образа жизни это хорошая новость, а для кого-то настоящая трагедия, однако и тем, и другим в 2014 году придется особенно внимательно следить за тем, что попадает в их желудок. В противном случае не исключены досадные проблемы с желудочно-кишечным трактом — от банальной изжоги и расстройства пищеварения до гастритов и других неприятностей. Кроме того, возможен неконтролируемый набор веса — Близнецам в 2014 году будет сложнее, чем обычно, следить за своей фигурой.

Чтобы избежать нежелательных последствий, звезды гороскопа советуют Близнецам в 2014 году приобщиться к здоровому питанию, включить в свой рацион больше свежих овощей и, фруктов и, главное, следить за тем, что написано на этикетках, включая срок годности. Соблюдать эти правила не так уж и сложно, если вспомнить мудрую французскую пословицу: “Ты то, что ты ешь”.

Рак

Для Рака 2014 год в плане здоровья обещает в общем и целом быть благоприятным. Единственное, чего ему следует избегать, — это излишних волнений и потрясений, которые могут не лучшим образом сказаться на его сердечно-сосудистой системе. Это тем более важно, если у Рака существуют реальные проблемы с сердцем, давлением или сосудами. В этом случае в 2014 году ему следует относиться к своему здоровью особенно бережно, досконально выполняя рекомендации врачей. Пренебрежение предписанным режимом дня, правильным питанием, нагрузками или другими врачебными советами в 2014 году способно принести Раку больше неприятностей и осложнений, чем в любой другой год.

Если же Рак не входит в группу риска, гороскоп советует ему в 2014 году потихоньку (без излишнего рвения и надрыва) начать тренировать свое сердце. Небольшая пробежка по утрам, бассейн или другие умеренные аэробные нагрузки помогут Раку существенно повысить тонус, а вместе с тем и качество своей жизни. Впрочем, в любом случае, в декабре даже самого ленивого, нетренированного Рака ожидает бурный всплеск — его жизненная энергия достигнет огромных высот!

Лев

Льву в 2014 году звезды гороскопа советуют обратить особое внимание на свой настрой, который просто обязан быть позитивным! Поводом к размышлению для него должен послужить тот факт, что мнительные ипохондрики на самом деле болеют чаще. Именно страхи и пессимизм подчас подтачивают здоровье не хуже иного вируса, и Льву в 2014 году не мешает почаще вспоминать об этом. Не поддаваясь унынию, волнениям и переживаниям, Лев имеет все шансы не только успешно противостоять любым болезням, но и укрепить свой организм. В противном же случае, увы, его иммунитет может раз за разом давать сбои.

Кроме того, звезды предупреждают Льва о том, что на протяжении всего 2014 года его легкие и желудок будут подвержены повышенному риску. В этой связи Льву стоит быть разборчивее в питании, ну а если он курит — очень желательно бросить эту опасную привычку, чтобы свести к минимуму риск обострения легочных и желудочных заболеваний.

Дева

В 2014 году главной проблемой для Девы может стать упадок сил, с которым ей необходимо бороться. В противном случае Дева способна впасть в апатию и за весь год сделать меньше дел, чем за месяц предыдущего. Впрочем, существует масса действенных средств, которые не позволят Деве в 2014 году поддаться хандре, и ей обязательно стоит попробовать хотя бы некоторые из них. Свежий воздух, оздоровительная гимнастика, путешествия, позитивные впечатления и, конечно же, любовь способны оказать на Деву в новом году поистине волшебное целительное действие!

Кроме того, 2014 год очень благоприятен для того, чтобы начать избавляться от проблем с суставами и опорно-двигательным аппаратом. Если же у Девы таких проблем нет, звезды гороскопа просто советуют ей обратить внимание на эту важную сферу. Любые упражнения, направленные на увеличение подвижности суставов и улучшение осанки, в 2014 году будут для нее эффективнее обычного. В этой связи Деве стоит купить абонемент на йогу — это поможет ей убить сразу двух зайцев: во-первых, поправить осанку, а во-вторых, увеличить поток жизненной энергии Ци.

Весы

В 2014 году Весам не стоит планировать серьезных шагов и перемен в своей жизни: успех обещает сопутствовать им, если они будут спокойно заниматься личными делами, не ставя перед собой глобальных задач.

Первую половину года Лошади в гороскопе Весов можно назвать весьма противоречивой. Весы будут полны энергии и энтузиазма и даже, возможно, захотят что-то в своей жизни круто изменить. Однако звезды не советуют им этого делать: чтобы избежать досадных накладок, большие проекты им лучше отложить на потом. Вместо того чтобы рваться вперед, в начале 2014 года этому знаку Зодиака надо всеми силами сдерживать свои новаторские порывы или направлять энергию в мирное русло, занимаясь творчеством, путешествуя и строя планы на личную жизнь.

А вот начиная с августа 2014 года остаться в стороне Весам вряд ли удастся: ситуация преподнесет им немало сюрпризов! Даже несмотря на то, что Весам по-прежнему противопоказаны глобальные перемены, в их жизнь ворвутся новые впечатления, события и эмоции. Вторая половина 2014 года для Весов будет отмечена большим количеством знакомств, общения, нового опыта. У Весов будет шанс побывать там, где они никогда еще не были, приобрести новые навыки, увидеть и узнать что-то интересное. У них не будет времени скучать!

Скорпион

Для Скорпиона 2014 год в плане здоровья обещает быть очень благоприятным! Чтобы весь год не болеть и чувствовать себя на “отлично”, гороскоп рекомендует ему на выбор любые посильные физические нагрузки: занятия фитнесом, зарядку по утрам, плавание в бассейне или утреннюю пробежку. Все это обещает повысить и без того высокий жизненный тонус Скорпиона, даря ему массу энергии и позитивный заряд. Иммунитет спортивного Скорпиона в 2014 году обещает быть на высоте: чтобы заработать банальный насморк, ему придется очень постараться. Даже зимовка с пингвинами на льдине не гарантирует ему простуду!

А вот если Скорпион собирается в 2014 году вести малоподвижный образ жизни, то это может пагубно отразиться если не на его здоровье, то как минимум на настроении и общем самочувствии. В этом случае осенью и зимой Скорпион рискует почувствовать усталость, апатию и упадок сил. Чтобы вывести себя из этого депрессивного состояния, ему придется встряхнуться и записаться в спортзал. Ничего не поделаешь, движение и только движение — залог отличного самочувствия Скорпиона в 2014 году.

Стрелец

Стрельцу звезды гороскопа обещают в 2014 году повышенный жизненный тонус, и это будет сказываться не только на его самочувствии, но и на всех сферах жизни. Особенно в первой половине года, когда избыток жизненной энергии Стрельца способен зашкаливать, делая его неотразимым в глазах противоположного пола. В этот период напору и животному магнетизму Стрельца будет трудно противостоять! Если же Стрелец состоит в браке, его избранник будет приятно удивлен вспыхнувшей в нем страстностью и силой его чувств.

Впрочем, повышенный тонус отразится не только на личной жизни Стрельца, но и на его общем самочувствии. Так, благодаря своей могучей жизненной силе, шанс заболеть простудными, вирусными и инфекционными заболеваниями у Стрельца в 2014 году будет намного меньше обычного — его иммунитет силен, как никогда.

Единственное “но”: из-за повышенной активности риск травматизма у Стрельца достаточно велик. Чтобы избежать всевозможных травм, порезов, ожогов, растяжений и прочих неприятностей, Стрельцу в 2014 году нужно сдерживать свою излишнюю порывистость. В этом смысле хорошим решением для него будет регулярное посещение фитнес-зала — это позволит ему давать выход избыточной энергии и выпускать лишний “пар”.

Козерог

Для Козерога 2014 год обещает пройти под знаком повышенного жизненного тонуса. Его бьющей через край энергии можно только позавидовать! Правда, в первой половине года, зимой и весной, гороскоп не рекомендует Козерогу использовать эту энергию в полную силу: в этот период залог его хорошего самочувствия — умеренность и равновесие. Козерогу придется немного умерить свой пыл и успокоиться, в чем ему способны помочь занятия йогой и медитативными практиками. Если же Козерог пойдет на поводу у своих эмоций и разовьет бурную деятельность, это грозит закончиться плачевно — усталостью, депрессией и срывом.

Впрочем, уже начиная с лета Козерогу совсем не обязательно обуздывать бушующую в нем силу — он может действовать так, как ему по душе. Звезды гороскопа лишь советуют ему направить энергию в какое-нибудь мирное русло: на занятия спортом, путешествия или любовь. Кроме того, в течение всего 2014 года Козерогу следует обратить внимание на суставы и их подвижность — чтобы с ними не возникло проблем, неоценимую помощь ему способны оказать йога, стрейчинг и другие упражнения на гибкость и растяжку.

Водолей

Пожалуй, если кто и может навредить здоровью Водолея в 2014 году, так это только он сам. Гороскоп предупреждает, что причиной проблем может стать его небрежное отношение к своему самочувствию, а также попытки заняться самолечением. Привычка Водолея искать рецепты в интернете в 2014 году способна привести к обострению уже имеющихся заболеваний или даже спровоцировать новые.

Так что главный совет Водолею — при наличии любых симптомов не умничать, а идти к врачу-специалисту. Соблюдая это нехитрое правило, он обеспечит себя здоровьем на весь год: его иммунитет и жизненная энергия при своевременном лечении помогут ему быстро справиться с любым недугом. Особенно благоприятен 2014 год для лечения суставов и опорно-двигательного аппарата: даже запущенные хронические заболевания в этой сфере есть шанс если и не полностью излечить, то сделать большой шаг на пути к излечению.

Рыбы

Первая половина года у Рыб пройдет на фоне повышенной сексуальной активности. Это, конечно, не означает, что все Рыбы в 2014 году рискуют окунуться в омут любовных страстей, тем не менее активность в этом плане у них будет явно выше, чем в другие годы.

К тому же 2014 год обещает быть благоприятным для лечения и укрепления сердечно-сосудистой системы. И гипертоники, и гипотоники Рыбы имеют хорошие шансы наконец-то нормализовать свое давление. С этой целью для них будут благоприятны занятия дыхательной гимнастикой, нордической ходьбой и другими видами несложного фитнеса. Однако не переусердствуйте! Помните, что все хорошо в меру, а норма — это прежде всего умеренность и равновесие.

Вторая половина 2014 года благоприятна для лечения гастритов и язвенных болезней. Ну а что касается хандры и депрессий, то в этом году у Рыб их будет меньше обычного!

МАЗАІКА

Ці паўторыць Вікторыя Азаранка свае поспехі мінулых гадоў?

Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка выйшла ў чвэрцьфінал Адкрытага чэмпіянату Аўстраліі — першага з чатырох у сезоне турніраў “Вялікага шлема”.

Учора ў чацвёртым крузе другая ракетка свету перамагла амерыканку Слоан Стывенс (13) з лікам 6:3, 6:2.

Наступнай саперніцай Азаранка будзе палячка Агнешка Радваньска, якая ў другім крузе перамагла беларуску Вольгу Гаварцову.

Нагадаем, што беларуская спартсменка выйгравала Australian Open у 2012 і 2013 гадах. І ў Вікторыі ёсць усе шанцы паўтарыць свае поспехі мінулых гадоў, бо яе асноўныя канкурэнткі — першая ракетка свету Серэна Уільямс і трэцяя ракетка Марыя Шарапава прайгралі і вылецелі з турніру.

Працягвае барацьбу і Максім Мірны ў пары з расіянінам Міхаілам Южным — яны таксама выйшлі ў чвэрцьфінал спаборніцтваў, дзе сустрэнуцца з парай — Лукаш Кубат (Польшча, 41)/Роберт Ліндстэт (Швецыя, 20), паведамляе БелаПАН.

У васьмёрку не патрапілі



Пасля паражэння ад палякаў у першым матчы другога этапу чэмпіянату Еўропы беларускія гандбалісты страцілі шанц трапіць у лік васьмі наймацнейшых каманд кантынента.

Матч у мінулую нядзелю са зборнай Польшчы завяршыўся пройгрышам каманды Юрыя Шаўцова з лікам 30:31, пры гэтым яшчэ за 2 хвіліны 17 секунд да канца сустрэчы яна вяла 30:27.

Дзве найлепшыя зборныя выходзяць у паўфінал, трэцяя правядзе стыкавы паядынак за пятае месца з трэцяй камандай групы 1.

Сёння наша каманда сустрэнецца з Францыяй, 22-га — з Расіяй. Нават у выпадку дзвюх перамог каманда Шаўцова не зможа падняцца вышэй за перадапошняе месца.

Прыехалі

Экіпаж Сяргея Вязовіча па выніках усіх 13 этапаў марафона “Дакар-2014” заняў 11-е месца. Гэта лепшы вынік беларусаў за тры гады ўдзелу ў сусветна вядомым ралі-рэйдзе.

“МАЗ” **Сяргея Вязовіча** прайграў лідару гонкі больш як 8 гадзін 36 хвілін, усяго 43 хвіліны не хапіла беларускаму экіпажу, каб трапіць у першую дзясятку. Калі б не паломка на 5-м этапе, якая адкінула гоншчыкаў назад, беларусы маглі ўвайсці ў пяцёрку лепшых на сёлетнім “Дакары”.

Экіпаж **Аляксандра Васілеўскага** завяршыў гонку на 31-м месцы з адставаннем ад лідара ў 30 гадзін 40 хвілін.

Трыумфатарам ралі стаў Андрэй Каргінаў з каманды “КАМАЗ-Майстар”, які на апошніх этапах з цяжкасцю вырваў перамогу ў Жэрара дэ Роя з Iveco.

Сяргей Вязовіч на 13-м этапе фінішаваў 6-м. На пераадоленне спецучастка пайшло каля 2 гадзін 23 хвілін. Ад пераможцы гонкі чэха Алеша Лопрайса з Tatra беларусы адсталі ўсяго на 5 хвілін 53 секунды.

Экіпаж Аляксандра Васілеўскага паказаў у апошні дзень гонкі 9-ы час. Яго грузавік праехаў спецучастак за 2 гадзіны 25 хвілін, прайграўшы чэху 7 хвілін 41 секунду.

Два этапы запар абодва беларускія экіпажы фінішавалі ў першай дзясятцы.

Асноўнай праблемай на ралі для беларусаў сталі алюмініевыя бакі, перагародкі ў якіх не вытрымалі нагрузак. Падчас дня адпачынку іх выразалі, пасля чаго сур’ёзных паломак не ўзнікала. Яшчэ адной перашкодай стала анамальная гарачыня: на асобных участках тэмпература паветра дасягала 45 градусаў.

Акрамя іншага, беларусам прыйшлося сутыкнуцца з праяўленнем неспартыўных паводзін з боку асобных каманд. *“У нас былі прэтэнзіі да некаторых экіпажаў, якія перашкаджалі нашым грузавікам сябе абагнаць. Мы не сталі гэта цярпець і падалі заяву арганізатарам. У рэшце рэшт гэта пытанне бяспекі: бо абгон у такіх умовах можа аказацца катастрафічным”*, — адзначыў куратар спартыўнай каманды “МАЗ-СПОРТаўта”, намеснік камерцыйнага дырэктара ААТ “МАЗ” **Дзмітрый Караткевіч**.

Сёлета “Дакар” аказаўся самым доўгім пасля пераезду ў Паўднёвую Амерыку — маршрут ралі праходзіў па тэрыторыі Аргенціны, Балівіі і Чылі. Падчас марафону грузавікі праехалі 9188 км, пазадарожнікі — 9374 км, матацыклы і квадрацыклы — 8734 км. Усяго ў гонцы ўдзельнічалі 174 матацыклы, 40 квадрацыклаў, 147 пазадарожнікаў і 70 грузавых аўтамабіляў. Каля паловы аўтамабіляў не даехалі да фінішу.

**Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск,
вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная:
тэл. (017) 3286871.
Тэл./факс
рэкламнага
аддзела: (017)
3286904, 3286906,
(029) 7753871
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info**

ISSN 2071-9647

9 772071 964000 14005

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Першы намеснік галоўнага рэдактара Святлана Міхайлаўна КАЛІНКІНА

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 20.01.2014 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 27080 экз. Заказ №83.